МУНДЗІЯЛЬ БУДЗЕ ГУЧНЫ

Дваццаць першы чэмпіянат свету па футболе стартуе сёння ў Расіі

Краіна ўпершыню ў сваёй гісторыі стане гаспадыняй сусветнага чэмпіянату па гэтым відзе спорту, акрамя таго, ён упершыню будзе праведзены ў краіне Усходняй Еўропы і на тэрыторыі адразу дзвюх частак свету — Еўропы і Азіі. Гульні на працягу месяца прымуць 12 стадыёнаў у 11 гарадах краіны.

У чэмпіянаце прымуць удзел сем з васьмі камандаў, якія раней ужо станавіліся чэмпіёнамі свету. Адзіная каманда з ранейшых уладальнікаў «золата» мундзіялю не ўдзельнічае ў фінальным турніры 2018 года — гэта зборная Італіі. Затое ўпершыню на чэмпіянаце выступяць зборныя Ісландыі і Панамы.

Гульні чэмпіянату свету прымуць: Масква, Калінінград, Санкт-Пецярбург, Ніжні Ноўгарад, Валгаград, Казань, Самара, Саранск, Растоў-на-Доне, Сочы і Екацярынбург. Дзяржаўныя кантракты на будаўніцтва ўсіх стадыёнаў чэмпіянату свету ў Расіі былі падпісаны 26 снежня 2014 года, пасля гэтага былі пабудаваны і рэканструяваны 12 стадыёнаў. З іх мінімальная ўмяшчальнасць у «Екацярынбург Арэны» — 35 000 гледачоў, максімальная ў «Лужніках» — 80 000 чалавек. Матч адкрыцця і фінал пройдуць у Маскве менавіта на гэтай арэне.

Афіцыйны лагатып чэмпіянату свету быў прадстаўлены 28 кастрычніка 2014 года ў эфіры Першага канала ў праграме «Вячэрні Ургант». У эмблеме ўгадваецца сілуэт Кубка свету ФІФА. Заваяванне космасу, іканапіс і любоў да футбола — тры складнікі лагатыпа. Афіцыйным талісманам стаў воўк Забівака, які быў абраны па выніках галасавання ў эфіры Першага канала. Афіцыйным гімнам чэмпіянату свету стане кампазіцыя Colors у выкананні амерыканскага спевака Джэйсана Дэрула.

Цырымонія адкрыцця адбудзецца сёння, вядома, што яе наведае Уладзімір Пуцін, а таксама іншыя кіраўнікі дзяржаў і ўрадаў. Афіцыйную песню чэмпіянату выканаюць вядомы амерыканскі акцёр Уіл Сміт, хіп-хоп-выканаўца Нікі Джэм, а таксама албанская спявачка Эра Істрэфі і амерыканскі музыкант Дыпла.

За месяц да старту чэмпіянату было рэалізавана 2 мільёны 374 тысячы квіткоў, што складае 89 % ад агульнай колькасці білетаў на матчы фінальнай часткі. Пры гэтым 46 % ад агульнай колькасці рэалізаваных квіткоў набылі расійскія балельшчыкі, а 54 % — замежныя. Лідарамі сярод замежных гледачоў сталі балельшчыкі з ЗША, Германіі, Бразіліі, Калумбіі, Мексікі і Аргенціны.

32 каманды падзелены на восем груп, па два найлепшыя калектывы квартэта выйдуць у плэй-оф.

Дар'я ЛАБАЖЭВІЧ.

Група A
- Расія
- Саудаўская Аравія
- Егіпет
- Уругвай

Група B
- Партугалія
- Іспанія
- Марока
- Іран

Група C
- Францыя
- Аўстралія
- Перу
- Данія

Група D
- Аргенціна
- Ісландыя
- Харватыя
- Нігерыя

Група E
- Бразілія
- Швейцарыя
- Коста-Рыка
- Сербія

Група F
- Германія
- Мексіка
- Швецыя
- Паўднёвая Карэя

Група G
- Бельгія
- Панама
- Туніс
- Англія

Група H
- Польшча
- Сенегал
- Калумбія
- Японія



Якая зборная самая дарагая

Большасць мужчын ва ўсіх кутках планеты, дзе ёсць тэлевізары і інтэрнэт, з сённяшняга дня на месяц практычна выпадуць з жыцця, працы, сям'і і іншых ячэек грамадства. Іх жонкі і сяброўкі (не ўсе, зрэшты) дружна ўзвыюць, уздымуць рукі да неба і праклянуць вынаходнікаў усяго таго, што круглае і скача. Бо настае ён — вялікі і жудасны чэмпіянат свету па футболе. Самымі папулярнымі ў гэты месяц стануць словы і фразы «Го-о-ол!», «Пас, зараза, пас!», «Мазіла!», «У футбол гуляюць усё, а перамагаюць немцы!», «Бразілія адпомсціць!», «Рускія не здаюцца!», «І я так магу!» і да таго падобныя. Акрамя таго, мужчынскае насельніцтва на час чэмпіянату можна турбаваць толькі з нагоды як мінімум землетрасення, сусветнага патопу, прылёту іншапланецян ці нараджэння сына/дачкі. Інакш магчымы сямейны канфлікт глабальнага маштабу. Ну а калі без жартаў, то вось трохі цікавых фактаў аб чэмпіянаце.

Бразілія, Германія і Месі

Самае галоўнае пытанне, бадай, любога сусветнага першынства адначасова даволі простае і вельмі складанае — хто стане чэмпіёнам? Яшчэ задоўга да пачатку мундзіялю складаюцца і збіраюцца розныя прагнозы, рэйтынгі, меркаванні спецыялістаў і зорак — часам і да астролагаў даходзіць, — у выніку якіх атрымліваецца невялікі спіс патэнцыйных кандыдатаў на трон. Кола прэтэндэнтаў амаль не змянілася за некалькі апошніх дзесяцігоддзяў. Нямецкая машына заўсёды настроена на перамогу, яе балельшчыкі і не разглядаюць іншых варыянтаў, як зберагчы званне дзейнага чэмпіёна, набытае, між іншым, у Бразіліі, і дагнаць апошніх па колькасці тытулаў — пяць.

Пентакампіёны (пяціразовыя чэмпіёны свету) вельмі хочуць «адмыцца» ад хатняй абразы ў 1:7 ад немцаў, і іх рашучасць памнажаецца на наяўнасць у страі пасля траўмы суперзоркі Неймара.

Бразілія-Германія — 1:7, 2014 г.

Уладальнік ну вельмі вялізнай колькасці ўзнагарод і стваральнік шматлікіх рэкордаў — аргенцінец Ліянель Месі не мае ў сваёй глыбокай скарбонцы толькі адной — звання чэмпіёну свету. Мяркуюць, што гэта апошні шанц зорнага нападаючага на галоўны тытул і нават усіх яго суперздольнасцяў не хопіць, калі яму не дапаможа каманда.

Вельмі хоча вярнуць нядаўна страчаныя лідзіруючыя пазіцыі ў сусветным футболе зборная Іспаніі. Шэраг маладых футбалістаў, новых зорак імкнуцца ўспомніць славутыя часы сваіх старэйшых калег па камандзе і зноў узняць іспанскі сцяг на п'едэстал.

Тыя ж памкненні, тая ж сітуацыя і тыя ж магчымасці ў вельмі маладой, але вельмі зорнай французскай дружыны — яны таксама хочуць славы Зінедзіна Зідана. І таксама настроены вельмі рашуча.

Што датычыцца астатніх камандаў, якім бы банальным гэта ні здавалася, але ім давядзецца на чэмпіянаце свету толькі папрысутнічаць, максімум абыграць адзін раз кагосьці з фаварытаў. Але гэта агульную карціну наўрад ці зменіць. Хіба што нейкая малавядомая каманда возьме і нечакана ўсіх абыграе, як Данія на чэмпіянаце Еўропы 1992 года. Але вы ў гэта верыце?

Хто пачым

Нямецкі сайт Transfermarkt, які змяшчае інфармацыю пра кошт матчаў, вынікі, трансферныя навіны, кошт гульцоў, напярэдадні чэмпіянату палічыў кошт зборных па суме кошту іх гульцоў, і вось якая атрымалася пяцёрка самых «дарагіх». 1. Францыя — 1,08 млрд еўра, 2. Іспанія — 1,04 млрд, 3. Бразілія — 952 млн, 4. Германія — 885 млн, 5. Англія — 874 млн. Як відаць, самыя дарагія кантракты, зразумела, у гульцоў самых моцных і тытулаваных зборных. Паглядзім, хто з іх пацвердзіць свой цэнавы ўзровень, а то і значна павялічыць свой заробак. А хто і наадварот.

Як уладкаваліся

Зборная Англіі па футболе аказалася адной з самых капрызных камандаў мундзіялю. Для пражывання брытанцы выбралі адзін з самых дарагіх гатэляў Курортнага раёна, дзе мінімальны кошт за ноч складае 100 тыс. еўра. Апартаменты ўключаюць у сябе паслугі спа, басейнаў, вялікай трэнажорнай залы, шыкоўных рэстаранаў і нават паравых лазняў. Аднак боязнасць брытанскіх балельшчыкаў перадалася і нацыянальнай зборнай, так што Футбольная асацыяцыя Англіі запатрабавала абгарадзіць базу велізарным шасціметровым плотам, што, дарэчы, так і не зрабілі. Раён пражывання каманды закрыты для наведванняў і патрулюецца паліцэйскімі.

Фіналісты мінулага чэмпіянату свету аргенцінцы палічылі за лепшае не з'язджаць далёка ад сталіцы, дзе яны правядуць стартавы матч супраць Харватыі, і арандавалі базу ў падмаскоўных Бронніцах. Напярэдадні свайго прыбыцця ў Расію Аргенціна завезла на базу тры тоны прадуктаў уласнай вытворчасці: ялавічыну, свініну, вараную згушчонку, матэ і іншае.

Дзейныя чэмпіёны Еўропы партугальцы, як і аргенцінцы, спыніліся недалёка ад Масквы. Нягледзячы на наяўнасць некалькіх палёў, партугальцы папрасілі змяніць некаторыя дэталі. Камандзе не спадабаўся колер сцен у нумарах, якія яны папрасілі перафарбаваць, а таксама яны звярнуліся з просьбай паставіць ва ўсе апартаменты коркавую мэблю і гульнявыя прыстаўкі з магчымасцю гульні па сетцы.

Іван КУПАРВАС.

УКЛЮЧАЙЦЕСЯ!

Тэлеканалы «Беларусь 5» і «Беларусь 2» правядуць прамыя трансляцыі ўсіх 64 матчаў Кубка свету ФІФА, які ўпершыню ў гісторыі прымае Расія. Ужо сёння на стадыёне ў Лужніках адбудзецца першая гульня — каманда Расіі сустрэнецца са зборнай Саудаўскай Аравіі.

«Што яшчэ мы падрыхтавалі для балельшчыкаў? Напрыклад, спецыяльны раздзел на сайце Белтэлерадыёкампаніі www.tvr.by, дзе змешчаны поўны расклад трансляцый усіх матчаў, — расказваюць на нацыянальным спартыўным тэлеканале. — Яшчэ там ёсць плэйліст з відэаролікамі пра расійскія стадыёны і падборка самых свежых навін чэмпіянату».



Бонусам напярэдадні мундзіялю «Беларусь 5» падрыхтаваў адмысловыя ролікі, у якіх каментатар-легенда Уладзімір Навіцкі на розных мовах запрашае калег у Расію на футбольнае першынство. Аўтары ролікаў інсцэніравалі антураж сталіц краін — галоўных прэтэндэнтаў на Залаты Кубак. Так, Павел Баранаў атрымлівае сваё запрашэнне ў Лондане на Бейкер-стрыт, Мікалай Хадасевіч знаходзіць яго на старым кірмашы ў Парыжы, Аляксандр Дзмітрыеў — у Берлінскім заалагічным садзе, Аляксандр Цвячкоўскі — у Лісабоне, а Сяргей Мацкевіч — непадалёк ад ракі Матанаса ў Буэнас-Айрэсе.

Вікторыя ЗАХАРАВА.

Расклад тэлетрансляцый

Дата	Час	Канал	Каманды
14 чэрвеня, чацвер	17:55	Беларусь 5	Расія — Саудаўская Аравія
15 чэрвеня, пятніца	14:50	Беларусь 5	Егіпет — Уругвай
	17:50		Марока — Іран
	20:50		Партугалія — Іспанія
16 чэрвеня, субота	12:50	Беларусь 5	Францыя — Аўстралія
	15:50		Аргенціна — Ісландыя
	18:50		Перу — Данія
	21:50		Харватыя — Нігерыя
17 чэрвеня, нядзеля	14:50	Беларусь 5	Коста-Рыка — Сербія
	17:50		Германія — Мексіка
	20:50		Бразілія — Швейцарыя
18 чэрвеня, панядзелак	14:50	Беларусь 5	Швецыя — Паўднёвая Карэя
	17:50		Бельгія — Панама
	20:50		Туніс — Англія
19 чэрвеня, аўторак	14:50	Беларусь 5	Калумбія — Японія
	17:50		Польшча — Сенегал
	20:50		Расія — Егіпет
20 чэрвеня, серада	14:50	Беларусь 5	Партугалія — Марока
	17:50		Уругвай — Саудаўская Аравія
	20:50		Іран — Іспанія
21 чэрвеня, чацвер	15:55	Беларусь 5	Данія — Аўстралія
	18:55		Францыя — Перу
	21:55		Аргенціна — Харватыя
22 чэрвеня, пятніца	14:50	Беларусь 5	Бразілія — Коста-Рыка
	17:50		Нігерыя — Ісландыя
	20:50		Сербія — Швейцарыя
23 чэрвеня, субота	14:50	Беларусь 5	Бельгія — Туніс
	17:50		Паўднёвая Карэя — Мексіка
	20:50		Германія — Швецыя
24 чэрвеня, нядзеля	14:50	Беларусь 5	Англія — Панама
	17:50		Японія — Сенегал
	20:50		Польшча — Калумбія
25 чэрвеня, панядзелак	16:50	Беларусь 5	Уругвай — Расія
		Беларусь 2	Саудаўская Аравія — Егіпет
	20:50	Беларусь 5	Іран — Партугалія
		Беларусь 2	Іспанія — Марока
26 чэрвеня, аўторак	16:50	Беларусь 5	Данія — Францыя
		Беларусь 2	Аўстралія — Перу
	20:50	Беларусь 5	Нігерыя — Аргенціна
		Беларусь 2	Ісландыя — Харватыя
27 чэрвеня, серада	16:50	Беларусь 5	Мексіка — Швецыя
		Беларусь 2	Паўднёвая Карэя — Германія
	20:50	Беларусь 5	Сербія — Бразілія
		Беларусь 2	Швейцарыя — Коста-Рыка
28 чэрвеня, чацвер	16:50	Беларусь 5	Японія — Польшча
		Беларусь 2	Сенегал — Калумбія
	20:50	Беларусь 5	Англія — Бельгія
		Беларусь 2	Панама — Туніс
30 чэрвеня, субота	16:50	Беларусь 5	1/8 фіналу
	20:50		1/8 фіналу
1 ліпеня, нядзеля	16:50	Беларусь 5	1/8 фіналу
	20:50		1/8 фіналу
2 ліпеня, панядзелак	16:50	Беларусь 5	1/8 фіналу
	20:50		1/8 фіналу
3 ліпеня, аўторак	16:50	Беларусь 5	1/8 фіналу
	20:50		1/8 фіналу
6 ліпеня, пятніца	16:50	Беларусь 5	1/4 фіналу
	20:50		1/4 фіналу
7 ліпеня, субота	16:50	Беларусь 5	1/4 фіналу
	20:50		1/4 фіналу
10 ліпеня, аўторак	20:50	Беларусь 5	1/2 фіналу
11 ліпеня, серада	20:50	Беларусь 5	1/2 фіналу
14 ліпеня, субота	16:50	Беларусь 5	Матч за 3-е месца
15 ліпеня, нядзеля	17:50	Беларусь 5	Фінал

АРАКУЛ НА ДЫЕЦЕ

Кот-аракул Ахіл скінуў 850 грамаў пасля таго, як яму ў лютым быў пастаўлены дыягназ «атлусценне», і рыхтуецца да чэмпіянату свету. Жывёла захоўвае спецыяльную дыету і займаецца на спартыўных трэнажорах (!), у тым ліку бегае ў коле. Ахіл будзе прадказваць вынікі гульняў на чэмпіянаце: кот павінен будзе выбраць адну з дзвюх місак з кормам са сцягамі краін-удзельніц. Глухі з нараджэння Ахіл пражывае ў Эрмітажы ў якасці мышалова разам з дзясяткамі іншых катоў. Ён праславіўся дакладнымі прадказаннямі вынікаў матчаў на Кубку Канфедэрацый у 2017 годзе і ў тым жа годзе быў названы самым папулярным катом Расіі.